А.А. Трусаў (Мінск)

# ВІЦЕБСКАЯ АРХІТЭКТУРНАЯ ШКОЛА

Віцебская архітэктурная школа — самабытная архітэктурная школа, якая склалася ў другой чвэрці XII стагоддзя. Яе адметнымі рысамі з'яўляецца дэкаратыўная мешаная муроўка, якая рабілася з добра абчасаных і падагнаных каменных блокаў, шэрагі якіх аддзяляюцца адзін ад аднаго двума шэрагамі плінфы. Звонку фасады былі атынкаваныя тонкім пластом тынкоўкі-заціркі, потым іх паверхня дзялілася белымі вапнавымі палоскамі (таўшчынёй каля 1,5 см) на русты адпаведна памерам каменных блокаў.

Да помнікаў гэтай школы можна аднесці віцебскую царкву Звеставання і Барысаглебскую царкву ў Навагрудку. Віцебскі храм мае шэраг адметнасцей, якія дазваляюць гаварыць аб асаблівасцях планіроўкі. Маючы ў аснове крыжава-купальную кампазіцыю, царква вызначаецца падкрэслена выцягнутай падоўжанай воссю, што надае ёй, асабліва ў інтэр'еры, базілікальны характар. Унутраную прастору храма падзялілі на тры нэфы, шэсць крыжападобных у плане апорных слупоў, пастаўленых у два рады. Паколькі крок слупоў набліжаўся па даўжыні да пралёту паміж імі, прасторавыя ячэйкі цэнтральнага нэфа атрымалі ў плане форму квадрата, як у раманскіх базіліках. Аднак тут захаваліся ў квадратных прасторавых ячэйках цыліндрычныя скляпенні-закамары, уласцівыя для полацкай архітэктуры. Храм меў фрэскавы роспіс і падлогу выкладзеную з дробных камянёў.

Шырыня храма 11,1 м, даўжыня без апсіды 18,2 м, з апсідай — 21 м. У заходняй сцяне (таўшчыня каля 1,5 м) размяшчалася лесвіца, якая вяла на хоры. Таўшчыня астатніх сцен каля 1,1 м. Фасады і інтэр'еры царквы былі ўрыгожаны плоскімі аднаступеньчатымі лапаткамі (шырыня вонкавых лапатак 0,8 м). Апсіду аздаблялі плоскія вертыкальныя цягі. Сцены будынка былі складзены ў тэхніцы дэкаратыўнай мяшанай муроўкі: часаныя вапняковыя блокі чаргаваліся з радамі плінфы, мелі закамары, на якія абапіраўся дах. Знешнія муры храма былі пакрыты вапняковай абмазкай, размаляванай белымі палоскамі шырынёй 1,5 см, адпаведна памерам каменных блокаў. У муроўцы выкарыстоўвалася плінфа памерам 3 — 3,7 x 19 — 20 x 27 — 29 см. (асноўны фармат), 2,8 x 15 x 21 см і 6 x 27 x 30 см. На тарцах і шырокіх баках плінфы трапляюцца знакі і клеймы.

Мы таксама маем звесткі пра вокны Дабравешчанскай царквы ў Віцебску. Аркавыя перамычкі вокнаў тут зроблены з абчасаных камянёў. Амбразуры іх пашыраліся як унутр, так і вонкі. У найбольш вузкім месцы захаваліся рэшткі закладзеных у муроўку дубовых аконніц.

У XII стагоддзі некаторыя храмы Полацка і Віцебска мелі падлогі, выкладзеныя з кубікаў тоўстага рознакаляровага шкла (смальты). Шмат смальты знойдзена падчас раскопак храма-спачывальні полацкіх епіскапаў. Гэта пласцінкі таўшчынёй ад 0,6 да 0,8 см рознай формы: квадраты, трохкутнікі і палоскі.

Смальта, знойдзеная ў Віцебску, уяўляе сабой кубік даўжынёй мм, шырынёй 8,7 — 7 мм (са схіламі да асновы) і вышынёй 8,5 мм. Вага кубіка 1,1 г. Смальта зроблена з бясколернага празрыстага шкла. На верхнюю грань кубіка пакладзена пазалота. Некаторыя храмы Віцебска XII стагоддзя мелі таксама падлогі і з паліваных плітак. Падчас раскопак на Верхнім замку знайшлі дзве керамічныя пліткі для падлогі XII стагоддзя, пакрытыя адпаведна зялёнай і жоўтай палівай.

Упершыню віцебскую царкву Звеставання грунтоўна даследаваў А.М. Паўлінаў. Ён падрабязна апісаў муроўку XII стагоддзя, склаў план храма і прапанаваў яго рэканструкцыю. У 1944 годзе абмеры царквы зрабіў П. Бараноўскі. Раскопкі каля будынка праводзілі ў 1964 годзе В. Штыхаў, у 1968 — М.К. Каргер. Была вызначана глыбіня падмуркаў, складзеных з невялікіх камянёў, не змацаваных растворам, і сцен, амаль на метр укапаных у мацярык. У 1982 годзе даследаванні рэштак храма прадоўжылі А.А. Трусаў, П.А. Рапапорт і Т.С. Бубенька. У выніку раскопак устаноўлена, што падлога складзена з невялікіх часаных камянёў, яе ўзровень падняты на 105 см вышэй цокаля будынка. Пад першапачатковай падлогай на глыбіні да 1 метра знаходзіцца пласт вапнавай рошчыны з дамешкамі дробных камянёў, пад якім залягае культурны пласт 0,4 — 0,6 м з керамікай 11 — 1-й чвэрці XII стагоддзя. Да 1961 года сцены будынка захоўваліся амаль на ўсю вышыню, у снежні 1961 храм быў разбураны. У 1977 рэшткі будынка закансерваваны. У 1992 годзе храм адбудаваны на старых падмурках.

Навагрудская Барысаглебская царква была ўзведзена на пасадзе старажытнага горада ў другой палове XII стагоддзя. Яе сцены складзены з вапняковых туфавых блокаў з нязначнымі ўстаўкамі плінфы. Храм быў размаляваны фрэскамі, меў умураваныя галаснікі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і керамічную падлогу з рознакаляровых паліваных плітак. Крыху пазней вакол царквы з трох бакоў была зроблена вонкавая галерэя, але толькі з плінфы ў тэхніцы муроўкі «са схаваным радам», уласцівай полацкай архітэктурнай школе XII стагоддзя.

Сцяна асноўнага аб'ёму храма зроблена ў тэхніцы дэкаратыўнай мешанай муроўкі, падобнай да віцебскай царквы Звеставання. Аднак тут сістэма муроўкі не такая дасканалая. Такі ж прыём, але крыху зменены, назіраецца ў архітэктуры іншых земляў Кіеўскай Русі. Так, напрыклад, паверхня фасадаў Ільінскай царквы ў Чарнігаве, збудаванай плінфы, была аформлена тонкай тынкоўкай жоўта-ружовага колеру, па якой палоскамі белай вапнавай рошчыны зроблены падзел вонкавай паверхні сцен на русты пад каменную муроўку.У XVI — XVII стагоддзях храм быў цалкам перабудаваны.

Храм даследавалі у 1961 — 1962, 1965 гадах: М.К. Каргер, у 1987 — А.М. Кушнярэвіч, у 1988 — А.А. Трусаў. М.К. Каргер датуе гэты помнік сярэдзінай — другой паловай XII стагоддзя. Калі меркаваць па тэхніцы муроўкі, асноўны аб'ём царквы зрабілі майстры з Віцебска, а бакавыя галерэі — дойлід з Полацка.

Магчыма, што храмы ў стылі віцебскай архітэктурнай школы былі таксама на Верхнім замку і слуцкім дзяцінцы. На віцебскім замку знойдзены кавалкі плінфы і некалькі паліваных плітак падлогі, а на слуцкім дзяцінцы — фрагменты каменных блокаў і плінфы.

Спалучэнне абчасаных каменных блокаў з пракладкамі з плінфы характэрна для будаўніцтва Візантыі і Балкан. Таму можна пагадзіцца з тымі даследчыкамі, якія лічаць, што віцебскую царкву Звеставання збудаваў візантыйскі дойлід, які і заснаваў на Беларусі самабытную архітэктурную школу.

*Літаратура і крыніцы*

1. Габрусь, Т. Зруйнаваныя святыні / Страчаная спадчына / Т.В. Габрусь, А.М. Кулагін, Ю.У. Чантурыя і інш.; уклад. Т.В. Габрусь. — Мінск: Полымя, 1998. — 351.
2. Штыхов, Г.В. Археологические раскопки в Витебске / Г.В. Штыхаў // Материалы IX конф. молодых ученых: Вопр. истории. — Минск, 1963.
3. Каргер, М.К. Церковь Благовещения в Витебске / М.К. Каргер // Краткие сообщ. Ин-та археологии АН СССР. — Москва, 1978. — Вып. 155.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Раппопорт, П.А. Русская архитектура X — XIII вв.: Каталог памятников / П.А. Раппопорт. — Ленинград: Наука, Ленингр. отд-ние, 1982. — 136 с.: ил.
5. Раппопорт, П.А. Церковь Благовещения в Витебске / П.А. Раппопорт // Памятники культуры. Новые открытия. — Москва, 1987.
6. Трусов, О.А. Памятники монументального зодчества Белоруссии XI — XVII вв.: Архитект.-археологический анализ / О.А. Трусов. — Минск: Наука и техника, 1988. — 160.: ил.
7. Трусаў, А.А. Манументальнае дойлідства Беларусі XI — XVIII стст. Гісторыя будаўнічай тэхнікі / А.А. Трусаў. — Мінск: ТАА Лекцыя, 2001. — 204 с.: іл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ